# XII сесія Генеральнай Асамблеі ААН

Н'Ю-ЙОРК, 25 верасня. (ТАСС). У пачатку ўчарашняга дзённага пасяджэння Генеральнай Асамблеі працягвалася агульная палітычная дыскусія. Выступілі прадстаўнікі Дамініканскай рэспублікі і Чэхаславакіі.

Пасля перапынку Асамблея аднавіла абмеркаванне пытання аб прадстаўніцтве Кітая ў ААН.

Нягледзячы на спробы амерыканскай дэлегацыі не дапусціць абмеркавання пытання аб прадстаўніцтве Кітая, яно фактычна ўжо абмяркоўваецца на пленарных пасяджэннях Асамблеі другі дзень. Амерыканскую дэлегацыю прыводзіць у шаленства тое, што ўжо амаль трэць членаў ААН выказалася за ўключэнне гэтага пытання ў парадак дня сесіі.

Міністр замежных спраў БССР К. В. Кісялёў заклікаў Генеральную Асамблею з усёй сур'ёзнасцю аднесціся да ўнесенай дэлегацыяй Індыі прапановы.

## Прамова К. В. Кісялёва

Пан старшыня,
Паны дэлегаты,

Дванаццатая сесія Генеральнай Асамблеі з усёй сур'ёзнасцю павінна аднесціся да ўнесенай дэлегацыяй Індыі прапановы аб аднаўленні законных правоў Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

З году ў год на сесіях Генеральнай Асамблеі прымалася несправядлівае рашэнне не разглядаць ніякіх прапаноў адносна прадастаўлення месца прадстаўнікам Цэнтральнага народнага ўрада Кітайскай Народнай Рэспублікі і аб выключэнні з Арганізацыі

тайскай Народнай Рэспублікі, якая ўнесла рад канструктыўных прапаноў, накіраваных на дасягненне ўзгодненых рашэнняў па асноўных пытаннях, разгледжаных канферэнцыяй. Цэнтральны народны ўрад Кітайскай Народнай Рэспублікі прыняў таксама рад мер, накіраваных на аслабленне напружанасці ў адносінах паміж Кітайскай Народнай Рэспублікай і заходнімі краінамі і, у прыватнасці, Злучанымі Штатамі Амерыкі.

Нельга недаацэньваць ролю Кітайскай Народнай Рэспублікі ў галіне міжнародных адносін, а адмова раду краін аднавіць за-

най Рэспубліцы яе законнае месца ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. За аднаўленне яе законных правоў у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый выступаюць палітычныя і грамадскія дзеячы самых рознастайных поглядаў і перакананняў. Ужо многія дзяржавы прызнаюць ненармальным той факт, што на працягу доўгага часу ў Арганізацыю Аб'яднаных Нацый не дапускаюцца прадстаўнікі шасцісотмільённага кітайскага народа, прадстаўнікі вялікай Кітайскай Народнай Рэспублікі, якая хутка будзе святкаваць восьмую гадавіну свайго існавання.

Адсутнасць Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый не толькі падрывае аўтарытэт нашай Арганізацыі, але і перашкаджае ёй паспяхова вырашаць важнейшыя пытанні міжнароднага жыцця, а асабліва пытанні, якія датычаць Азіі і Далёкага Усходу.

Вось чаму дэлегацыя Беларускай ССР падтрымлівае прапанову дэлегацыі Індыі аб уключэнні ў парадак дня дванаццатай сесіі Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый пытання аб прадстаўніцтве Кітая ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы